# "Беларусам я завуся, родным краем ганаруся"







**13 студзеня каманды вучняў СШ№11 г.Ліды, Крупаўскай сярэдняй школы і Бердаўскі дзіцячы сад-сярэдняя школа Лідскага раёна былі запрошаны на ўрачыстае ўзнагароджанне пераможцаў онлай-гульні "Беларусам я завуся, родным краем ганаруся" ў Казлоўшчынскую СШ Дзятлаўскага раёна.**

З мэтай фарміравання грамадзянскасці і патрыятызму асобы, засваення агульначалавечых гуманістычных каштоўнасцей, культурных, духоўных традыцый беларускага народа з 27 лістапада па 3 студзеня ДУА “Казлоўшчынская сярэдняя школа” была арганізавана online-гульня “Беларусам я завуся, родным краем ганаруся”. Удзельнікамі гульні сталі 32 каманды 5-7 класаў з трыццаці адной установы адукацыі Гродзенскай вобласці, у тым ліку дванаццаць каманд з Лідскага раёна, і адна каманда з установы адукацыі Брэсцкай вобласці.

На працягу пяці тыдняў знаёмства ўдзельнікаў гульні было віртуальным. Каманды выконвалі заданні на пяці прапанаваных этапах: “За смугою стагоддзяў”, “Беларусь у імёнах і падзеях”, “Гонар сучаснай Беларусі”, “Падарожжа па Беларусі”, “Традыцыі, абрады і кухня Беларусі”.

13 студзеня ў шосты школьны дзень Казлоўшчынская сярэдняя школа сабрала пераможцаў online-гульні “Беларусам я завуся, родным краем ганаруся” на Калядную сустрэчу. Гасцямі свята сталі чатыры каманды пераможцы Лідскага раёна: дзве каманды сярэдняй школы № 11 г. Ліды “Патрыёты краіны” і “Суквецце”, Крупаўскай сярэдняй школы “Зорачкі”, Бердаўскага дзіцячага сада-сярэдняй школы “Адмыслоўцы”.

Вучні і педагогі ўстановы адукацыі прывіталі гасцей па народных звычаях добрымі словамі, песняй “Запрашаем у госці да нас!” і хлебам-соллю. Зберагаючы традыцыі спадчыны, гасцям прапанавалі адну з самых вядомых і любімых страў беларускай кухні – дранікі.

За дапамогай пры праходжанні этапаў гульні вучні звярталіся да сваіх настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры, гісторыі, геаграфіі, музыкі, мастацтва і нават фізічнай культуры і здароўя.

Кіраўнікоў каманд дадзеная гульня натхніла на стварэнне сваіх online-гульняў і праектаў.

Дыпломамі II ступені былі ўзнагароджаны каманды “Патрыёты краіны” сярэдняй школы №11 г. Ліды (кіраўнікі К.В. Валынец, С.Л. Бяляўская), каманда “Зорачкі” Крупаўскай сярэдняй школы (кіраўнік С.С.Кашлей), каманда “Адмыслоўцы” Бердаўскага дзіцячага сада-сярэдняй школы (кіраўнік Г.А.Альшэўская). Дыплом III ступені атрымала каманда “Суквецце” сярэдняй школы №11 г. Ліды (кіраўнік Анашкевіч Н.М.).



Беларускія песні, гульні, танцы, падрыхтаваныя вучнямі, педагогамі школы і работнікамі мясцовага Дома культуры, стварылі непаўторную святочную атмасферу ў гэты дзень.

Напрыканцы свята, перадаючы па крузе калядную зорку, удзельнікі мерапрыемства пажадалі адзін аднаму шчасця, здароўя, дабрабыту, міру, спакою і цудаў.

А ў адрас арганізатараў online-гульні “Беларусам я завуся, родным краем ганаруся” і Каляднай сустрэчы вучні і настаўнікі Лідскага раёна выказваюць словы падзякі і захаплення, спадзеючыся на тое, што на наступны год у нас таксама з’явіцца магчасць прыняць удзел у наступным этапе гульні.